ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)
УДК 323.1(476) + 930.1(476)
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2019-64-3-312-319

Паступіў у рэдакцыю 19.03.2019
Received 19.03.2019

**Д. А. Крэнт**

*Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь*

# ДЗЕЙНАСЦЬ ЛАТЫШСКАГА НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАГА ПАДРАЗДЗЯЛЕННЯ ПРЫ ІНСТЫТУЦЕ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ І БЕЛАРУСКАЙ АКАДЭМІІ НАВУК (1928–1936 гг.)

**Аннотация.** Одной из особенностей организации науки в БССР в межвоенный период стал учет фактора национального разнообразия населения Беларуси. Интерес представляет деятельность при Институте белорусской культуры латышского научно-исследовательского подразделения. На основании документов, которые появились в результате деятельности латышского подразделения, определены особенности его функционирования. Процесс формирования латышского подразделения растянулся во времени. Латышская исследовательская единица первоначально оформилась как вспомогательная структура в составе Инбелкульта для обслуживания нужд одноименной комиссии в Москве. В 1929–1931 гг. латышское подразделение превратилось в самодостаточную исследовательскую единицу по изучению латышей в Беларуси. В последующие годы происходит расширение тематики его исследований. Значительное внимание стало уделяться изучению национальной политики в Латвии. Сотрудниками латышской научной единицы были начаты исследования по филологии. Организация филологических исследований, вместе с проведением массовой (агитационной) работы, рассматривалась как средство включения латышского населения в процесс социального и культурного строительства в Советской Беларуси. Свертывание латышских исследований при АН БССР связано с изменениями национальной политики в Советском государстве.

**Ключевые слова**: национальная политика, Латвийский сектор БАН, латыши, национальное меньшинство, Карл Шкильтер

**Для цитирования.** Крэнт, Д. А. Дзейнасць латышскага навукова-даследчага падраздзялення пры Інстытуце беларускай культуры і Беларускай акадэміі навук (1928–1936 гг.) / Д. А. Крэнт // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2019. – Т. 64, № 3. – С. 312–319 https://doi.org/10.29235/2524-2369-2019-64-3-312-319

**D. A. Krent**

*Institute of History National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

# ACTIVITY OF LATVIAN RESEARCH DEPARTMENT AT THE INSTITUTE OF BELARUSIAN CULTURE AND THE BELARUSIAN ACADEMY OF SCIENCES (1928–1936)

**Abstract.** One of the factors that influenced the process of institutionalization of the scientific sphere of Belarus in the interwar period was the national diversity of its population. This, in particular, is evidenced by the organization of the Latvian research unit at the Institute of Belarusian Culture (IBC). The article determines the specific features of its functioning using its original documents. It is stated that the process of forming the Latvian research unit stretched out over time. It was initially formed as an auxiliary one in the structure of IBC mostly to serve the needs of the commission of the same name in Moscow. Gradually the Latvian unit has been turned into a self-sufficient research structure issuing scientific literature concerning the state of Latvians in Belarus. Acceleration in social, national and cultural construction in the 1930s contributed to the expansion of the problematic field of the Latvian scientific unit. On the one hand, its studies were devoted to Latvians in Belarus. On the other hand, considerable attention was paid to the comprehension of the national question in Latvia itself. The research unit focused on the involvement of the Latvian population in the process of social and cultural construction in the BSSR, as evidenced by the development of the philological direction of research, and in particular by the preparation of the Latvian-Belarusian dictionary.

**Keywords:** national policy, Latvian sector of the Belarusian Academy of Sciences, Latvians, national minority, Karl Schkilter

**For citation.** Krent D. A. Activity of Latvian research Department at the Institute of Belarusian culture and the Belarusian Academy of Sciences (1928–1936). *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series*, 2019, vol. 64, no. 3, pp. 312–319 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2019-64-3-312-319

© Крэнт Д. А., 2019

**Уводзіны.** Міжваенны перыяд у БССР – час інстытуалізацыі навуковай сферы дзейнасці. Дадзенаму працэсу была ўласціва дынамічнасць, што дэманструюць шматлікія рэарганізацыі і змены структуры навукова-даследчых устаноў. Спецыфічнай рысай, якая ўплывала на арганізацыю і развіццё навукі, з'яўлялася нацыянальная і культурная разнастайнасць насельніцтва Беларусі. Пра апошняе сведчыць арганізацыя пры Інстытуце беларускай культуры (з 1929 г. – Беларуская акадэмія навук) даследчых адзінак, якія займаліся вывучэннем нацыянальных меншасцей у БССР. Інтарэс выклікае дзейнасць латышскага падраздзялення, функцыянаванне якога ў гістарычнай літаратуры атрымала павярхоўны разгляд.

Мэтай даследавання з'яўляецца асвятленне дзейнасці Латышскай навукова-даследчай адзінкі, выяўленне матываў яе ўзнікнення і скасавання, вызначэнне тэматычнай скіраванасці даследаванняў яе супрацоўнікаў.

**Матэрыялы і метады.** Асноўным матэрыялам для дадзенай працы сталі дакументы, якія сфарміраваліся ў выніку дзейнасці латышскага падраздзялення, друкаваныя працы яго супрацоўнікаў, а таксама даследаванні, прысвечаныя гісторыі Інбелкульта і Беларускай акадэміі навук. Аўтарам пры напісанні артыкула выкарыстоўваліся як агульнанавуковыя (аналіз, сінтэз), так і ўласнагістарычныя метады даследавання (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны).

**Асноўная частка.** Адной з асаблівасцей арганізацыі даследчай дзейнасці Інстытута беларускай культуры стаў зварот да вывучэння нацыянальных меншасцей у Беларусі. Апошняе садзейнічала з'яўленню ў яго структуры шэрага нацыянальных даследчых адзінак. З 1921 г. пры Наркамаце асветы БССР дзейнічала яўрэйская гістарычная камісія, якая пазней увайшла ў структуру Інбелкульта і была рэарганізавана ў яўрэйскі аддзел [1, с. 131]. У пачатку 1925 г. аформіўся польскі аддзел. З лістапада 1927 г. пачала функцыянаваць кафедра гісторыі Літвы, у кампетэнцыю якой уваходзіла ў тым ліку і вывучэнне літоўскага насельніцтва ў БССР [2, с. 95]. Асаблівасцю камплектацыі памянёных даследчых падраздзяленняў стала прыцягненне да працы прадстаўнікоў тых народнасцей, якія ўваходзілі ў кампетэнцыю іх вывучэння. Існаванне падобных структурных адзінак надавала Інбелкульту рысы наднацыянальнай навуковай установы.

Замацаванне за Інбелкультам статуса навуковага цэнтра па вывучэнню нацыянальных меншасцей у Беларусі адбылося пасля разгортвання працы латышскага падраздзялення. Першыя згадкі пра спробы арганізацыі ў структуры Інстытута беларускай культуры латышскай даследчай адзінкі адносяцца да 1926 г. Падмуркам для яе з'яўлення стала пастанова СНК БССР ад 10 ліпеня 1926 г. аб арганізацыі латышскага аддзела [3, с. 8]. Аднак працэс яго афармлення расцягнуўся ў часе. У інфармацыі Інбелкульта, падрыхтаванай для Нацыянальнай камісіі пры ЦВК БССР у верасні 1926 г., адзначалася, што ў сучасны момант пры ім існуюць яўрэйскі і польскі аддзелы, а таксама здзяйсняюцца захады для арганізацыі латышскага [4, арк. 92]. У канцы 1926 – пачатку 1927 г. кіраўніцтвам Інбелкульта быў распрацаваны план даследчай адзінкі, які складаўся з дзвюх частак. Азнаямленне з першай часткай дакумента дазваляе высветліць, што даследчая адзінка працягвала знаходзіцца ў стадыі арганізацыйнага афармлення. Другая частка плана была прысвечана вызначэнню тэматыкі даследаванняў яшчэ не арганізаванага падраздзялення. Аддзел мусіў скіравацца на вывучэнні наступных пытанняў: латышскае насельніцтва на Беларусі падчас рэвалюцый 1905 і 1917 гг.; латышская мова ў Беларусі; латышская культура; лютэранская царква ў Беларусі; латышская літаратура; асаблівасці побыту латышоў Беларусі; эканамічны ўклад, пры гэтым асноўны акцэнт павінен быць зроблены на формы вядзення сельскай гаспадаркі і яе культурны ўхіл [5, арк. 128 адв. – 129]. Заўважна, што складальнікі плана арыентаваліся на стварэнне самадастатковай даследчай адзінкі з разгалінаванай тэматыкай даследаванняў.

Запавольванне працэсу арганізацыі аддзела варта звязаць з наступнай акалічнасцю. Кіраўніцтва Інбелкульта рабіла стаўку на камплектацыю даследчай адзінкі мясцовымі кадрамі латышскага паходжання [5, арк. 128 адв.]. У той жа час колькасць латышоў у БССР не перавышала 14 000 чалавек згодна з перапісам 1926 г. Большая частка насельніцтва пражывала ў сельскай мясцовасці, займалася сельскагаспадарчымі заняткамі, мела нізкі адукацыйны ўзровень. Для латышоў, якія імкнуліся атрымаць вышэйшую адукацыю гуманітарнага профілю, цэнтрам прыцягнення станавілася Масква, дзе пры Камуністычным універсітэце меншасцей Захаду існавала адпаведнае нацыянальнае аддзяленне. Такім чынам, у Савецкай Беларусі адсутнічалі кваліфіка-

ваныя спецыялісты, якія маглі займацца латышскай праблематыкай, і база для іх падрыхтоўкі. Апошняе пацвярджаюць і вывады прадстаўнікоў Нацкамісіі пры ЦВК БССР, якія канстатавалі, што ў рэспубліцы адчуваецца востры недахоп у спецыялістах для вядзення культурнай, прапагандысцкай і асветніцкай работы сярод латышскага насельніцтва [3, с. 92].

Варта спыніцца і на той акалічнасці, што да стварэння падобнага падраздзялення ў Савецкай Беларусі праявілі інтарэс не толькі прадстаўнікі беларускага кіраўніцтва і культурнай эліты. У яе з’яўленні была зацікаўлена латышская супольнасць РСФСР. Восенню 1926 г. па ініцыятыве латышскага Бюро УКП(б) была арганізавана Цэнтральная камісія па даследаванню латышскіх калоній СССР у Маскве. На яе першым пасяджэнні 10 лістапада 1926 г. было прынята рашэнне арганізаваць шэраг абласных даследчых установаў на абшарах Савецкага Саюза. Планавалася ўтварыць рэгіянальныя камісіі ў Башкартастане, Паўночна-заходняй вобласці РСФСР (з цэнтрам у Ленінградзе), Сібіры і Беларусі. Па меркаванні сяброў камісіі, галоўнай задачай лакальных адзінак павінна была стаць каардынацыя дзейнасці краязнаўчых гурткоў з мэтай збірання патрэбных для Цэнтра матэрыялаў [6, арк. 2].

Такім чынам, да пачатку 1927 г. афарміліся два падыходы да арганізацыі навуковай дзейнасці па даследаванню латышскага насельніцтва ў Савецкай Беларусі. З аднаго боку, кіраўніцтва Інбелкульта імкнулася да стварэння самадастатковай даследчай адзінкі, у кампетэнцыю якой уваходзіла б комплекснае вывучэнне латышоў у Беларусі. З другога боку, даследчы цэнтр у Маскве быў зацікаўлены ў стварэнні ў БССР дапаможнай структуры для збору патрэбных у яе працы факталагічных звестак.

Дакументы Інбелкульта толькі на мяжы 1927–1928 гг. фіксуюць наяўнасць у яго структуры Камісіі па вывучэнню гісторыі і культуры латышоў Беларусі (Латышскай камісіі). Першая інфармацыя аб дзейнасці даследчай адзінкі адносіцца да сярэдзіны 1928 г. У сваю чаргу кіраўнік Інбелкульта У. Ігнатоўскі адзначаў, што праца яе (Латышскай камісіі. – *Д. К.*) ажывілася толькі з вясны 1928 г. [7, с. 15]. Таму разгортванне работы камісіі варта аднесці да першай паловы 1928 г.

Пачатак дзейнасці пры Інбелкульце памянёнай структурнай адзінкі трэба звязаць з зацікаўленасцю ў яе існаванні латышскага навуковага цэнтра ў Маскве. Кіраўніком камісіі і яе адзіным супрацоўнікам стаў К. Шкільтэр, які да пераезду ў Мінск з’яўляўся сакратаром аднайменнай камісіі ў Маскве. Першапачаткова даследаванні камісіі Інбелкульта праводзіліся па падрыхтоўцы трохтомніка “Гісторыя латышскіх калоній у СССР”. У адзначаным шматтомніку планавалася асвятліць наступныя пытанні: прычыны перасялення латышоў у Расію і працэс узнікнення латышскіх калоній (першы том); аграрныя адносіны і працэс калектывізацыі ў латкалоніях (другі том); ідэалогія, быт, культурная праца і нацыянальнае пытанне (трэці том). Канкрэтная работа камісіі ў адзначаны час праводзілася над выяўленнем крыніц для падрыхтоўкі другога і трэцяга тамоў памянёнага вышэй трохтомніка [8, арк. 61]. Падкрэслены агульнасаюзны ахоп даследаванняў і збіральніцкі характар працы сведчаць пра дапаможны характар дзейнасці камісіі Інбелкульта ў 1928 г. на карысць маскоўскага даследчага цэнтра.

Змены ў характары дзейнасці Латкамісіі супалі з рэарганізацыяй Інбелкульта ў БАН у 1929 г. Значная ўвага пачала надавацца стварэнню метадычнай літаратуры. Загадчык камісіі спрыяў надрукаванню ў часопісе “Наш край” артыкула К. Мартэнсона па праблеме збору этнолага-лінгвістычных матэрыялаў сярод латышскага насельніцтва БССР [9; 6, арк. 83]. Акрамя таго, К. Шкільтэрам асобнай брашурай была выдадзена праграма па даследаванні латышскіх калоній. Галоўны акцэнт у праграме надаваўся выяўленню крыніц па эканамічна-дэмаграфічным становішчы латышскіх пасяленняў. Работа мела падкрэслены інструкцыйна-метадычны характар, даследчык заклікаў, каб “складальнікі апісанняў латышскіх калоній дасылалі свае матэрыялы на адрас Латышскай камісіі БАН” [10].

Супрацоўнікамі камісіі К. Шкільтэрам і М. Жоўдзелем праводзілася экспедыцыйная работа ў латышскіх пасяленнях Віцебскай і Полацкай акруг у 1929–1931 гг. Даследчыкамі збіраўся разнастайны па свайму характару матэрыял: этнаграфічны, сацыяльна-эканамічны, фальклорны. Цікавым фактам з’яўляецца тая акалічнасць, што падчас экспедыцыйнай працы сярод мясцовага насельніцтва выяўляліся дакументальныя крыніцы. Апошняе дало падставу сучасным даслед-

чыкам прыйсці да высновы, што К. Шкільтэр з'яўляўся адным з нешматлікіх навукоўцаў у БССР, які праводзіў палявыя археаграфічныя вышуканні [11, с. 197–198].

Пэўнае ўяўленне аб характары дакументаў, выяўленых падчас экспедыцый, дае справа № 17, якая захавалася ў архіўным фондзе № 3 (Інстытут гісторыі) Цэнтральнага навуковага архіва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі [12]. Пад яе вокладкай сабраны дакументы жыхароў вёскі Выдрэя Віцебскай акругі. У згаданай справе знаходзяцца копіі судовых пратаколаў і выракаў, пасведчанні аб добранадзейнасці шэрага яе жыхароў, выпіскі з метрычных кніг і інш. Інтарэс з дадзенага комплексу дакументаў прадстаўляюць падрабязныя вопісы рухомай і нерухомай маёмасці многіх латышскіх гаспадарак з ваколіц згаданай вышэй вёскі [12, арк. 122–158]. Памянёныя вопісы не былі датаваны, аднак азнаямленне з друкаванымі працамі загадчыка камісіі К. Шкільтэра дазваляе ўстанавіць, што дадзеныя матэрыялы былі падрыхтаваны іх гаспадарамі ў 1915 г. [13, с. 126].

Камісія пашырала ўзаемадзеянне з установамі Савецкай Беларусі. Падчас палявых даследаванняў 1930 г. было наладжана супрацоўніцтва з Віцебскім і Полацкім краязнаўчымі музеямі. Планавалася перадаць на захаванне ў іх фонды калекцыю фотаздымкаў, якія былі зроблены падчас экспедыцыйнай работы ў 1929 і 1930 гг. [6, арк. 135].

Акрамя падрыхтоўкі метадычнай літаратуры і правядзення палявых даследаванняў, значная ўвага пачала надавацца стварэнню аналітычных абагульненняў. Пры гэтым відавочна імкненне да напісання работ не агульнасаюзнага маштабу, а абмежаваных выключна тэрыторыяй БССР. Ужо ў плане працы камісіі на 1930 г. дэкларавалася, што камісія будзе весці падрыхтоўку гістарычнага даследавання, прысвечанага латышам у Беларусі. На падставе сабраных падчас палявых даследаванняў матэрыялаў, а таксама іншых крыніц К. Шкільтэрам у 1931 г. быў выдадзены нарыс "Латышскія калоніі на Беларусі. Гістарычнае развіццё латышскіх сялянскіх гаспадарак" [13]. Памянёная праца стала першым навуковым даследаваннем, якое было прысвечана гісторыі латышскага насельніцтва Беларусі. Варта падкрэсліць, што даследчык у нарысе разглядаў выключна гісторыю эканамічнага развіцця латышскіх пасяленняў у БССР, а астатнія сюжэты з жыцця латышскага насельніцтва асвятляліся фрагментарна [7].

Фактычна на працягу 1929–1931 гг. латышскай даследчай адзінкай БАН быў пройдзены шлях ад дапаможнай структуры, існаванне якой было абумоўлена задачай збірання факталагічнага матэрыялу, да самастойнай даследчай адзінкі, дзейнасць якой была ўключана ў беларускую праблематыку. У той жа час даследаванні камісіі абмяжоўваліся вывучэннем гістарычнага мінулага латышскага насельніцтва Савецкай Беларусі. Падобную тэматычную абмежаванасць варта звязаць з недахопам кадраў. Штат камісіі складаўся з двух чалавек і толькі адзін з іх з'яўляўся навуковым супрацоўнікам.

Пачынаючы з 1932 г. назіраецца паступовае пашырэнне даследчай тэматыкі сектара. З аднаго боку, супрацоўнікі працягнулі развіваць праблему гісторыі і сучаснага становішча латышскага насельніцтва ў Беларусі. У 1932 г. планавалася выдаць брашуру, прысвечаную распаду рэлігійных арганізацый латышскага насельніцтва ў БССР і СССР [15, s. 42]. Акрамя таго, была здзейснена спроба прыцягнуць мясцовых краязнаўцаў да стварэння аналітычных абагульненняў па адзначанай праблеме. У 1933 г. калектывам аўтараў, пры арганізацыйнай падтрымцы даследчай адзінкі, планавалася падрыхтаваць працу па гісторыі латышскіх паселішч і калгасаў на Лёзненшчыне [16, с. 40]. Апошняй маштабнай работай, прысвечанай латышскаму насельніцтву ў Савецкай Беларусі, стала манаграфія К. Шкільтэра "Латышскі селянін на Беларусі да і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі". Аднак азнаямленне з галоўнымі палажэннямі працы сведчыць, што яна з'яўлялася не арыгінальным даследаваннем, а перапрацаваным перакладам на латышскую мову нарыса 1931 г. [17, с. 131 – 135].

З другога боку, супрацоўнікі даследчай адзінкі звярнуліся ў сваіх работах і да вывучэння Латвіі. Значная ўвага надавалася асэнсаванню нацыянальнай палітыкі, якая праводзілася ў Латвійскай Рэспубліцы. Так, у 1933 г. К. Шкільтэрам была выдадзена праца па латгальскім нацыянальным пытанні [18]. Зварот да дадзенай праблемы варта звязаць з няпэўнасцю статуса латгальскай этнічнай групы ў міжваеннай Латвіі.

Супрацоўнікам сектара Я. Доўгім з 1932 г. распрацоўвалася тэма "Беларускі нацыянальна-вызваленчы рух у Латвіі". На падставе сабраных матэрыялаў ім была падрыхтавана на беларускай і латышскай мовах брашура "Беларускі нацыянал-фашызм у Латвіі" [19; 20]. Падобную змену акцэнту даследавання, прысвечанага беларусам у Латвіі, варта звязаць з наступнай акалічнасцю. Большасць беларускіх арганізацый у Латвіі, якія ўзначальвалі былыя дзеячы БНР (К. Езавітаў і інш.), ставілася варожа да камуністычнай ідэалогіі. У той жа час пракамуністычны беларускі рух у Латвіі не меў моцнай арганізацыйнай структуры. Таму беларускія арганізацыі, якія функцыянавалі на латвійскай тэрыторыі, прадстаўляліся ў даследаванні як агенты ўплыву мясцовай буржуазіі для выканання наступных задач: садзейнічаць расколу і аслабленню польскага і рускага нацыянальных рухаў, а таксама адцягненню беларускіх працоўных мас ад рэвалюцыйнай барацьбы.

Значная ўвага надавалася крытыцы латвійскіх гістарычных даследаванняў. К. Шкільтэрам з 1935 г. распрацоўвалася тэма "Латвійская буржуазная гістарыяграфія (крытычны нарыс)". Абрывачныя звесткі дазваляюць вызначыць, што значнае месца ў даследаванні мусіла надавацца крытыцы канцэпцый этнагенезу латышоў і зараджэння феадальных адносін у Латвіі [21, с. 5; 22, с. 5]. Аднак падрыхтоўка дадзенай работы была перапынена ў сувязі з арыштам навукоўца ў снежні 1937 г.

Падобны паварот тэматыкі даследаванняў сектара яскрава ілюструе новыя задачы, якія ўскладаліся на нацыянальныя навукова-даследчыя адзінкі БАН у цэлым і латышскага падраздзялення ў прыватнасці. Яшчэ ў 1932 г. на пасяджэнні Прэзідыума Акадэміі навук падкрэслівалася, што толькі ў СССР і БССР як яго заходнім фарпосце праводзіцца арганічная палітыка па падтрымцы нацыянальных культур розных народаў у параўнанні з нацыянальнай палітыкай у фашысцкіх Польшчы, Літве і Латвіі [23, арк. 162]. У сувязі з гэтым выглядае натуральным, што перад даследчыкамі нацыянальных падраздзяленняў паўстала задача тэарэтычнага абгрунтавання падобнага тэзісу. Не скрывалі падобнай скіраванасці даследаванняў і супрацоўнікі латышскай адзінкі. К. Шкільтэр наступным чынам ацэньваў сваю працу па латгальскім пытанні: "гэта праца ўскрывае палітыку латышскай буржуазіі ў фашысцкай Латвіі, якая падвяргае нацыянальнаму ўціску нацменшасці Латвіі – латгальцаў, яўрэяў, беларусаў і інш. і паказвае трыумф ленінскай нацыянальнай палітыкі ў СССР" [21, с. 5].

Важнай задачай, якая ўскладвалася на супрацоўнікаў сектара, з'яўлялася ўключэнне латышскага насельніцтва ў працэс сацыяльнага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР. У сувязі з гэтым значная ўвага надавалася масавай рабоце. Па свайму характару адзначаны кірунак працы здзяйсняўся праз супрацоўніцтва з культурна-асветніцкімі ўстановамі БССР. У дадзеным выпадку найбольш цеснае ўзаемадзеянне было наладжана з Віцебскім і Мінскім латышскімі клубамі. Яны сталі пляцоўкай для супрацоўнікаў сектара, дзе зачытваліся даклады навукова-папулярнага і агітацыйнага характару. Напрыклад, у 1933 г. планавалася прачытаць даклады наступнага зместу: "Нацыянальнае пытанне ў буржуазнай Латвіі і СССР" (К. Шкільтэр); "Пастаноўка палітасветнай работы сярод латышскага насельніцтва ў БССР" (В. Панке); "Рэвалюцыйная барацьба латвійскага пралетарыяту і белы тэрор" (В. Панке) і інш. [16, с. 41].

Імкненне інтэграваць латышскае насельніцтва Савецкай Беларусі ў працэсы сацыялістычнага будаўніцтва садзейнічала актывізацыі мовазнаўчых даследаванняў. Я. Доўгі сумесна з асістэнтам сектара В. Панке праводзілі падрыхтоўку па складанню беларуска-латышскага слоўніка. У справаздачы сектара за першае паўгоддзе 1933 г. адзначалася, што на момант яе напісання было падабрана каля 20 000 слоў для слоўніка, але праца гэта мусіла выконвацца большым калектывам, улічваючы яе маштаб і аб'ёмы (заяўлены ў плане на 1933 г. памер слоўніка складаў 20–25 друкаваных аркушаў. – *Д. К.*) [24, арк. 72]. Мовазнаўчы кірунак даследаванняў меў свой працяг, пра што сведчыць аднаўленне секцыяй палявых даследаванняў у 1935 г. Задачай экспедыцыі стала збіранне лінгвістычных і фальклорных матэрыялаў сярод латышскіх калгаснікаў Савецкай Беларусі [21, с. 5].

Дакументы выдавецтва БАН дазваляюць высветліць, што праца па падрыхтоўцы слоўніка была завершана, і яго рукапіс быў накіраваны да друку ў пачатку лютага 1936 г. [25, арк. 3]. Аднак змена палітычнай кан'юнктуры, рэпрэсіўныя мерапрыемствы супраць шэрага адказных супра-

цоўнікаў Акадэміі не дазволілі апублікаваць слоўнік. У жніўні 1937 г. друкаванне слоўніка было спынена па прычыне яго палітычнай шкоднасці. У сваю чаргу, аддрукаваная частка выдання і яго рукапіс былі знішчаны [26, арк. 41].

Латышская даследчая адзінка падтрымлівала сувязі з прадстаўнікамі латышскай супольнасці ў РСФСР. Супрацоўніцтва падтрымлівалася з культурна-асветніцкім таварыствам "Праметэй". Дзякуючы супрацоўніцтву з таварыствам, стаў магчымы выхад друкаванай прадукцыі сектара на латышскай мове. Акрамя таго, сектарам было наладжана супрацоўніцтва з латышскім пісьменнікам і палітыкам камуністычнай арыентацыі Л. Лайцэнам, які ў 1932 г. пераехаў з Латвіі ў СССР і стала пражываў у Маскве. Пісьменнік рыхтаваў для даследчай адзінкі даследаванне "Тэорыя і практыка латышскага рэвалюцыйнага тэатра" [24, арк. 72]. Акрамя таго, Л. Лайцэн выступаў рэцэнзентам для шэрага работ падраздзялення. У сваю чаргу супрацоўнікі даследчай адзінкі прымалі ўдзел у падрыхтоўцы перакладаў твораў пісьменніка на беларускую мову [27].

Такім чынам, з 1932 г. назіраецца паступовае пашырэнне даследчай тэматыкі латышскай даследчай адзінкі. З аднаго боку, пашыраецца праблематыка вывучэння латышскага насельніцтва ў Савецкай Беларусі, адбываецца разгортванне філалагічнага кірунку даследаванняў, з другога – значнае месца ў работах сектара пачало займаць вывучэнне Латвіі і ў першую чаргу асэнсаванне праводзімай у ёй нацыянальнай палітыкі. Варта адзначыць, што тэарэтычныя напрацоўкі даследчыкаў выкарыстоўваліся для ідэалагічнай апрацоўкі латышскага насельніцтва ў БССР.

На працягу свайго існавання латышскае падраздзяленне пры БАН прайшло шэраг трансфармацый і рэарганізацый. У маі 1931 г. латышская даследчая адзінка, у выніку ўніфікацыі структуры БАН, атрымала статус сектара. На базе латышскага і літоўскага сектараў у чэрвені 1933 г. быў арганізаваны Інстытут пралетарскай культуры літоўскай, латышскай і іншых народнасцей БССР. Аб'яднанне памянёных устаноў варта звязаць з наступнай акалічнасцю. Другая генерацыя кіраўнікоў Беларускай акадэміі (П. Горын, П. Панкевіч, В. Шчарбакоў і інш.) была зарыентавана на стварэнне навукова-даследчых інстытутаў як формы арганізацыі акадэмічнай навукі. Гэта датычылася ў тым ліку і нацыянальных навуковых падраздзяленняў БАН. Ужо восенню 1932 г. былі ўтвораны польскі і яўрэйскі інстытуты. Зліццё ж латышскага і літоўскага сектараў у адзін інстытут варта звязаць з іх малалікасцю. Так, у латышскай адзінцы стала працавалі толькі тры асобы, у літоўскай – чатыры. Для параўнання: у польскім інстытуце налічвалася 8 супрацоўнікаў, у яўрэйскім – 22 [28, с. 209]. Можна меркаваць, што літоўская і латышская часткі новаўтворанага Інстытута працавалі адасоблена. Пра гэта сведчаць матэрыялы, пададзеныя нацыянальнымі інстытутамі аб іх дзейнасці для газеты "Калгаснік Беларусі" ў пачатку красавіка 1935 г. У асобнай нататцы памянёнага выдання апавядаецца пра працу Секцыі латышскай пралетарскай культуры [21, с. 5].

Летам 1935 г. усе нацыянальныя інстытуты былі аб'яднаны ў адзіны Інстытут нацыянальных меншасцей БАН. Аднак і дадзены Інстытут быў ліквідаваны ў маі 1936 г. Скасаванне памянёнай даследчай установы варта звязаць з дзвюма прычынамі. Па-першае, з сярэдзіны 1930-х гг. назіраецца змена канцэптуальнага бачання ў разуменні і практычнай рэалізацыі нацыянальнай палітыкі. Вынікам адзначаных змен стала запавольванне і згортванне мерапрыемстваў, скіраваных на падтрымку культурных і адукацыйных патрэб нацыянальных меншасцей. Па-другое, скасаванне Інстытута нацыянальных меншасцей варта звязаць і з асаблівасцямі развіцця Беларускай акадэміі навук. Менавіта ў першай палове 1936 г. назіраецца новы этап перабудовы працы Акадэміі, які быў абумоўлены прыходам на пасаду яе прэзідэнта І. Сурты. Кадравы патэнцыял скасаванай даследчай адзінкі быў скарыстаны для ўзмацнення іншых устаноў Акадэміі і ў першую чаргу інстытутаў гісторыі, мовазнаўства і літаратуры [29, арк. 72–73]. У далейшым самастойныя ўстановы на нацыянальнай аснове ў структуры АН БССР не ствараліся, а даследаванні па латышскай праблематыцы былі паступова згорнуты да канца 1937 г.

**Заключэнне.** Такім чынам, латышскае навукова-даследчае падраздзяленне ў БССР прайшло значны шлях на працягу свайго існавання. Утвораная, дзякуючы намаганням латышскіх дзеячаў СССР (як дапаможная структура для абслугоўвання патрэб падобнай установы ў Маскве), камісія паступова ператварылася ў самадастатковую даследчую адзінку пры БАН. Яе супра-

цоўнікамі і, у першую чаргу, яе загадчыкам К. Шкільтэрам быў зроблены значны ўнёсак у вывучэнне гісторыі латышскага насельніцтва ў БССР. Апошняе выявілася як у падрыхтоўцы метадычнай літаратуры па даследаванню латышскіх паселішч, арганізацыі шэрага экспедыцый камісіі ў раёны кампактнага пражывання латышскага насельніцтва, так і ў стварэнні аналітычных абагульненняў на падставе сабранага матэрыялу. Абгрунтаванне тэзіса аб слушнасці нацыянальнай палітыкі, якая праводзілася ў БССР і СССР, вымушала даследчыкаў латышскай адзінкі звярнуцца і да латвійскай праблематыкі, якая актыўна распрацоўвалася, пачынаючы з 1933 г. Значнае месца ў рабоце латышскага падраздзялення займала і праблема інтэграцыі латышскага насельніцтва Савецкай Беларусі ў працэсы сацыялістычнага будаўніцтва, што выявілася ў актывізацыі масавай працы і разгортванні мовазнаўчага кірунку даследаванняў. Змены ў разуменні нацыянальнай палітыкі, якая праводзілася ў Савецкай дзяржаве, садзейнічалі ліквідацыі нацыянальных даследчых адзінак і згортванню даследаванняў па латышскай праблематыцы.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Еўрэйскі Аддзел Інстытуту Беларускай культуры // Асьвета. – 1924. – № 2. – С. 131–132.

2. Шпилевский, И. Ф. Белорусская академия наук на пороге второй пятилетки (исторический очерк) : пер. с перераб. белорус. изд. / И. Ф. Шпилевский, Л. А. Бобрович. – Минск : [б. и.], 1933. – 112 с.

3. Практическое разрешение национального вопроса в БССР : по материалам Нац. комис. ЦИК БССР : [в 2 ч.]. – Минск : Изд. Нац. комис. ЦИК БССР, 1928. – Ч. 2 : Работа среди национальных меньшинств в БССР. – 159 с.

4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 701. Воп. 1. Спр. 17.

5. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНА НАН Беларусі). – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 24.

6. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 72. Воп. 1. Спр. 11.

7. Ігнатоўскі, У. М. Ад беларускай Тэрмінолёгічнай камісіі да беларускай Акадэміі навук / У. М. Ігнатоўскі // Наш край. – 1928. – № 12. – С. 6–16.

8. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 23.

9. Мартэнсон, К. Зьбіраньне этнолёгічна-лінгвістычных матар'ялаў сярод латыскага насяленьня БССР / К. Мартэнсон // Наш край. – 1929. – № 3. – С. 53–54.

10. Šķilters, K. Latweešu koloniju pētišahas programa / K. Šķilters. – Minsk : Baltkreewijas Zinatņu Akad., 1929. – 12 s.

11. Сыцько, К. В. Палявыя археаграфічныя даследаванні: методыка і асаблівасці правядзення / К. В. Сыцько // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2018. – Т. 63, № 2. – С. 196–205. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2018-63-2-196-205

12. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 17.

13. Шкільтэр, К. Ю. Латыскія колёніі на Беларусі. Гістарычнае разьвіцьцё латыскіх сялянскіх гаспадарак / К. Ю. Шкільтэр. – Менск : Беларус. акад. навук, 1931. – 271 с.

14. Betriebsplan der Weissrussischen Akademie der Wissenschaften für das Jahr 1932. – Minsk : Weissrussische Akad. der Wiss., 1931. – 118 S.

15. Вытворчы план Беларускай акадэміі навук на 1933 год / [адк. рэд. М. Бурсевіч]. – Менск : Выд-ва БАН, 1933. – 117 с.

16. Šķilters, K. Latvju zemneeks Baltkreevijā pirms un pēc Oktobra revolucijas : vēsturiska monografija / K. Šķilters. – Minskā : Baltkreewijas Zinatņu Akad. izdevneeciba, 1935. – 144 s.

17. Šķilters, K. Latgales nacionalais jautajums / K. Šķilters. – Minskā : Baltkreewijas Zinatņu Akad. izdevneeciba, 1934. – 98 s.

18. Доўгі, Я. Беларускі нацыянал-фашызм у Латвіі / Я. Доўгі. – Менск : Выд-ва Беларус. акад. навук, 1933. – 9 с.

19. Dolgijs, J. Baltkreevu nacionalfašisms Latvijā / J. Dolgijs. – Minskā : Baltkreewijas Zinatņu Akad. izdevneeciba, 1934. – 51 s.

20. Шкільтэр, К. Ю. Секцыя латышскай пролетарскай культуры : [аб навук. дзейнасці латыш. даследчага падраздзялення пры БАН] / К. Ю. Шкільтэр // Калгасьнік Беларусі. – 1935. – 4 крас. – С. 5.

21. Тэматычны план Акадэміі навук БССР на 1937 год : праект. – Менск : Выд-ва Акад. навук БССР, 1937. – 32 с.

22. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 16а.

23. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 72. Воп. 1. Спр. 13.

24. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 62. Воп. 1. Спр. 6.

25. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 62. Воп. 1. Спр. 13.

26. Лайценс, Л. Лімітрофія : пер. з лат. / Л. Лайценс ; пер. Я. Я. Доўгага. – Менск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1936. – 380 с.

27. Шаўчук, І. І. З вопыту арганізацыі нацыянальнай навукі ў БССР / І. І. Шаўчук, Г. У. Карзенка // Этноконфессиональные процессы в истории Беларуси : сб. науч. ст. по итогам Респ. науч.-теорет. конф., Минск, 12 дек. 2016 г. / Белорус. нац. техн. ун-т ; редкол.: В. А. Божанов, С. В. Боголейша. – Минск, 2016. – С. 205–213.

28. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 50.

## References

1. Jewish Department of the Institute of Belarusian Culture. *As'veta* [Education], 1924, no. 2, pp. 131–132 (in Belarusian).

2. Shpilevskii I. F., Bobrovich L. A. *Belarusian Academy of Sciences on the powder of the second five-year plan (historical sketch).* Minsk, 1933. 112 p. (in Russian).

3. *Practical resolution of the national question in the BSSR. Part 2. Work among national minorities in the BSSR*. Minsk, Publication of the National Commission of the Central Executive Committee of the BSSR, 1928. 159 p. (in Russian).

4. *National Archives of the Republic of Belarus*. F. 701. Vop. 1. Spr. 17. (in Belarusian).

5. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 67. Vop. 1. Spr. 24. (in Belarusian).

6. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 72. Vop. 1. Spr. 11. (in Belarusian).

7. Ignatouski U. M. From the Belarusian Terminology Commission to the Belarusian Academy of Sciences. *Nash kraj* [Our Land], 1928, no. 12, pp. 6–16 (in Belarusian).

8. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 67. Vop. 1. Spr. 23. (in Belarusian).

9. Martenson K. Collection of ethnological and linguistic material among the Latvian population of the BSSR. *Nash kraj* [Our Land], 1929, no. 3, pp. 53–54 (in Belarusian).

10. Šķilters, K. *Latweešu koloniju pētišahas programa* [Latvian Colonial Research Program]. Minsk, Baltkreewijas Zinatņu Akademijas, 1929. 12 p. (in Latvian).

11. Syts'ko K. V. Method and features of conducting field archeographic expeditions (on the example of heuristics of sources on the history of Roman Catholic Church). *Vestsi Natsyianal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series,* 2018, vol. 63, no. 2, pp. 196–205 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2018-63-2-196-205.

12. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 3. Vop. 1. Spr. 17. (in Belarusian).

13. Shkil'ter K. Yu. *Latvian colonies in Belarus. Historical development of Latvian farms.* Minsk, Belarusian Academy of Sciences, 1931. 271 p. (in Belarusian).

14. *Betriebsplan der Weissrussischen Akademie der Wissenschaften für das Jahr 1932* [Operational Plan of the Belarusian Academy of Sciences for the year 1932]. Minsk, Weissrussische Akademie der Wissenschaften, 1931. 118 p. (in German).

15. *Operational Plan of the Belarusian Academy of Sciences for the year 1933*. Minsk, Publishing House of the Belarusian Academy of Sciences, 1933. 117 p. (in Belarusian).

16. Šķilters K. *Latvju zemneeks Baltkreevijā pirms un pēc Oktobra revolucijas: vēsturiska monografija* [Latvian Farmer in Belarus before and after the October Revolution: Historical Monograph]. Minsk, Baltkreewijas Zinatņu Akademijas zdevneeciba, 1935. 143 p. (in Latvian).

17. Šķilters, K. *Latgales nacionalais jautajums* [Latgale national issue]. Minsk, Baltkreewijas Zinatņu Akademijas izdevneeciba, 1934. 98 p. (in Latvian).

18. Dougi Ya. *Belarusian national-fascism in Latvia*. Minsk, Publishing House of the Belarusian Academy of Sciences, 1933. 49 p. (in Belarusian).

19. Dolgijs, J. Baltkreevu nacionalfašisms Latvijā [Belarusian national-fascism in Latvia]. Minsk, Baltkreewijas Zinatņu Akademijas izdevneeciba, 1933. 49 p. (in Latvian).

20. Shkil'ter K. Section Latvian Proletarian Culture. *Kalhas'nik Belarusi* [Belorusian Farmer], 1935, 4 april, pp. 5 (in Belarusian).

21. *Thematic plan of the BSSR Academy of Sciences for the year 1937: project*. Minsk, Publishing House of the Belarusian Academy of Sciences, 1937. 32 p. (in Belarusian).

22. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 1. Vop. 1. Spr. 16a. (in Belarusian).

23. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 72. Vop. 1. Spr. 13. (in Belarusian).

24. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 62. Vop. 1. Spr. 6. (in Belarusian).

25. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 62. Vop. 1. Spr. 13. (in Belarusian).

26. Laitsens L. Limitrophe. Minsk, State Publishing House of Belarus, 1936. 380 p. (in Belarusian).

27. Shauchuk I. I., Karzenka G. U. Fom the experience of the organization of national science in Belarus. *Etnokonfessional'nye protsessy v istorii Belarusi: sbornik nauchnykh statei po itogam Respublikanskoi nauchno-teoreticheskoi konferentsii, Minsk, 12 dekabrya 2016 g.* [Ethno-confessional processes in the history of Belarus: a collection of scientific articles on the results of the Republican scientific-theoretical conference, Minsk, December 12, 2016]. Minsk, 2016, pp. 205–214 (in Belarusian).

28. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus*. F. 1. Vop. 1. Spr. 50. (in Belarusian).

## Информация об авторе

**Крент Дмитрий Александрович** – аспирант. Институт истории, Национальная академия наук Беларуси (ул. Академическая, 1, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: dzmitriy.krent@yandex.ru

## Information about the author

**Dzmitriy A. Krent** – Postgraduate Student. Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus (1 Academiczeskaya Str., Minsk 220070, Belarus). E-mail: dzmitriy.krent@yandex.ru